ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА • • NO. 39 (3495) • • ЧАЦВЕР, 20 КАСТРЫЧНІКА, 2016

ШТОТЫДНЁВІК "ГОЛАС РАДЗІМЫ" МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: WWW.GOLAS.BY



**Чатыры падворкі віталі сяброў**

Беларусы Малдовы стварылі цэлую вуліцу на 15-м этнакультурным фестывалі ў Кішынёве Стар. 2



**Палітра фактаў, вобразаў, лёсаў**

Стар. 3



**Слова матчына дадому павядзе**

У дзейнасці суполкі "Уздым" з Даўгаўпілса прыкметная цяга да лепшых узораў беларускага пісьменства Стар. 4

ПЛАНЕТА ЛЮДЗЕЙ

# Парад на Саборнай вуліцы

## Ва Усеўкраінскім фестывалі нацыянальных культур "Дружба" паўдзельнічала і беларуская суполка "Голас Радзімы" з Мікалаева

По традыцыі штовосень Мікалаеўскі аблсавет нацыянальных таварыстваў праводзіць этнафестываль, на якім прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў паказваюць сваё мастацтва, культурныя традыцыі. Сёння "Дружба" мае элементы шоу, фестываль дапамагае энтузіястам зберагаць самабытную культуру сваіх народаў на ўкраінскай зямлі. Як гаворыць старшыня праўлення Савета нацыянальнасцяў Лаліта Каймаразава, фестываль – гэта свята прадстаўнікоў этнасуполак не толькі Мікалаеўшчыны, поўдня Украіны, але і ўсёй краіны. На ім можна пабачыць шмат з таго, чым багатая Украіна шматнацыянальная: танцы, народныя напевы, яркія касцюмы. Прычым удзельнікі фестывалю маюць адкрытыя сэрца, гатовыя дзяліцца радасцю творчасці з гледачамі. "Мы – адзіныя, – упэўнена Лаліта Каймаразава. – Хоць і гаворым на розных мовах, і спяваем розныя песні, але ў душах нашых жыве любоў і сяброўства".



Беларусы з суполкі "Голас Радзімы" на фестывальнай вуліцы ў Мікалаеве

Цяпер фестываль праходзіць у плыні абласной мэтавай нацыянальна-культурнай праграмы "Захаванне і развіццё этнічнай, культурнай і моўнай самабытнасці нацменшасцяў Мікалаеўскай вобласці". Актыўна паўдзельнічала ў ім і наша суполка: Мікалаеўскае абласное нацыянальна-культурнае таварыства беларусаў "Голас Радзімы". Спачатку на Саборнай, галоўнай вуліцы горада, у каштанавым скверы прайшоў песенна-танцавальны канцэрт. Фальклорны гурт суполкі спяваў беларускія песні "Бульбачка" і "Цячэ вада ў ярок". Гледачам спадабалася: яны і падпявалі, і падтанцоўвалі.

Прадстаўнікі розных этнасуполак імкнуліся паказаць самабытнасць, прыгажосць сваёй культуры: беларусы, армяне, азербайджанцы, крымскія караімы, грузіны, грэкі, палякі, яўрэі, балгары і, вядома ж, украінцы. Яркім відовішчам стаў святочны парад: пад сцягамі розных дзяржаў, у традыцыйных строях, з песнямі ды вершамі ўсе мы прайшлі па Саборнай да абласнога Палаца культуры. Там працавала выстава прадметаў культуры і побыту розных народаў: карціны, ручнікі, нацыянальнае адзенне, кнігі, упрыгажэнні, цацкі... Наша экспазіцыя зацікавіла многіх, ля нашых сталоў было шмат людзей: разглядалі ручнікі ды іншыя тканыя, вышываныя вырабы, сувеніры, кнігі, газеты. Як заўсёды, вялікую ўвагу прыцягвала яркая, з густам аформленая газета "Голас Радзімы", якую мы штотыдзень атрымліваем па пошце з Бацькаўшчыны. Вялікі дзякуй за гэта Беларусі, рэдакцыі газеты!

Актывісты нашай суполкі ў прыгожых нацыянальных строях таксама прыцягвалі ўвагу. З намі многія віталіся, казалі добрыя словы пра Беларусь і беларусаў, фатаграфаваліся на памяць. А файныя строі, дарэчы, нам падарыў Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур Мінкультуры Беларусі, паспрыялі таму Амбасада Беларусі ва Украіне і Генконсульства Беларусі ў Адэсе. Усім нашым дабрадзеям – вялікі дзякуй і паклон!

Свята прайшло ў атмасферы дружбы, міру, любові. Прадстаўнікі ўсіх этнасуполак адчувалі сваю еднасць, бо Мікалаеўшчына – гэта адзін з самых шматнацыянальных рэгіёнаў Украіны. Нягледзячы на розную гісторыю, мовы, традыцыі, веру, усе ўдзельнікі фестывалю паказалі: мы адзіныя і дружныя, бо для ўсіх, дзе б мы ні нарадзіліся, Украіна цяпер – дарагая і родная. Як і тая зямля, адкуль у нас родавыя карані.

**Таццяна Дзяменнікава,**
кіраўніца суполкі "Голас Радзімы", г. Мікалаеў

ВЕСТКІ

## Ад Мінска да Цюмені

**Рыгор Арэшка**

**Ушанаваны вядомыя творчыя калектывы беларускай дыяспары ў Расіі**

Па прадстаўленні Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў Расіі пяць самадзейных творчых калектываў беларусаў ды іх кіраўнікі, муніцыпальная ўстанова культуры і актывісты дыяспары адзначаны граматай Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур – за вялікі ўклад у захаванне і пашырэнне беларускай народнай культуры ў Расіі. Інфармацыя ёсць на сайце http://www.belros.org/

Сярод узнагароджаных ёсць і тыя, каго ведаюць чытачы "Голасу Радзімы". Гэта, у прыватнасці, два гурты дыяспары з Цюменьскай вобласці: народны фальклорна-этнаграфічны "Вячоркі" (створаны ў 1986 г.) ды народны фальклорны "Россияночка" (створаны ў 1991 г.) Ермакоўскага сельскага Дома культуры – абодва з Вікулаўскага раёна. Адзначаны іх мастацкія кіраўнікі (заслужаная работніца культуры Расіі Валянціна Міхіенка ды Надзея Вычужаніна) і муніцыпальная аўтаномная ўстанова культуры "Цэнтр культуры і вольнага часу Ввікулаўскага раёна". У кіраўніцы цэнтра Алены Серабраковай, як мы пісалі, бацька – этнічны беларус (гл.: "Роду глыбокія карані", ГР, 03.06.2015).

Ушанаваны і Ганаровы генеральны консул Беларусі, стваральнік суполкі "Саюз-інтэграцыя брацкіх народаў" Уладзімір Шугля, вядучы спецыяліст аддзела па справах этнакультурных аб'яднанняў і казацтва Камітэта па справах нацыянальнасцяў вобласці Сяргей Яфімчык. Дарэчы, Сяргей Аляксандравіч раней узначальваў праўленне Нацыянальна-культурнага таварыства Цюменьшчыны "Аўтаномія Беларусь", яны з жонкаю Святланай – салісты вядомага ў Цюмені ансамбля "Лянок".

ЛІНІЯ ЖЫЦЦЯ

# Гульня ў імя дабрыні

**Іна Ганчаровіч**

**Сацыяльную актыўнасць аматара футбола Юрыя Бялецкага з горада Жабінка (Брэстчына) адзначылі спецыялісты УЕФА**

Калі коратка пра заслугі: ён з нуля стварыў футбольны клуб. Хоць у яго няма ні мільёнаў, ні сувязяў у свеце вялікага спорту. А ўласны аматарскі футбольны клуб "Росток" ёсць: у ім займаюцца 60 хлопчыкаў ва ўзросце ад 6 да 15 гадоў.

Раней вялікага футбола ў Жабінцы, гарадку на захадзе Брэсцкай вобласці, не было. Бокс, плаванне, мнагабор'і, лёгкая атлетыка, тэхнічныя віды спорту…Стадыён з футбольнымі варотамі, мяч, нейкія выпадковыя матчы – а каманды не было. Стварыць яе вырашыў мясцовы рабочы, шматдзетны бацька, гарачы аматар футбола Юры Бялецкі. Дзякуючы яго ініцыятыве, настойлівасці цяпер працуе маладзёжнае грамадскае аб'яднанне "Аматарскі футбольны клуб "Росток". Між тым у спорт сысці, як кажа Юры, вымусілі яго сямейныя абставіны. У бацькі тры сыны і дачка, і ўсе захапляюцца футболам. Трэнеры бачаць: перспектыўныя! Паколькі секцыі ў Жабінцы не было, бацька вазіў іх на трэніроўкі ў Брэст. А часам і сам праводзіў трэніроўкі



Юры Бялецкі разам з юнымі футбалістамі

на мясцовым стадыёне. Патроху да Бялецкіх далучаліся іншыя юныя аматары футбола. Так у 15-тысячным горадзе ўзнікла каманда. Неяк, згадвае Юры, прыехалі з нейкіх спаборніцтваў, а хлопчыкі кажуць: "Дзядзька Юра, а давайце клуб створым…". ➔ Стар. 4

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

# Чатыры падворкі віталі сяброў

## Беларусы Малдовы стварылі цэлую вуліцу на 15-м этнакультурным фестывалі ў Кішынёве

Рэспубліканскі этнакультурны фестываль “Адзінства праз разнастайнасць” сёлета быў юбілейным, праходзіў у Малдове з 16 па 25 верасня. Як заўжды, арганізатарамі свята выступілі Бюро міжэтнічных адносін Малдовы ў партнёрстве з этнакультурнымі суполкамі, мэрыяй муніцыпія Кішынёў. Гэты фестываль спрыяе захаванню і прымнажэнню традыцый этнаменшасцяў, развіццю міжкультурнага дыялогу і ўмацаванню дружалюбных стасункаў паміж прадстаўнікамі розных этнасаў, што жывуць у краіне.

Урачыстае адкрыццё фестывалю адбылося ў цэнтры Кішынёва, у парку “Stefan cel Mare si Sfânt” пры ўдзеле кіраўніцтва краіны, дыпламатаў і прадстаўнікоў этнакультурных арганізацый, акрэдытаваных пры Бюро міжэтнічных адносін Малдовы і мэрыі Кішынёва. Беларусы Малдовы годна прадставілі сваю самабытнасць, народны каларыт. Дзеля таго суладна працавалі чатыры беларускія суполкі, выкарысталі ўласныя сродкі. Удзельнікі ды госці фестывалю змаглі палюбавацца цэлай беларускай вуліцай, якая з'явілася на адной з цэнтральных алей парка.

Наша суполка, Беларускі культурны рух Малдовы, зрабіла экспазіцыю “Культурная спадчына Беларусі”. Знайшлі сваіх зацікаўленых гледачоў-чытачоў выстаўленыя кнігі: пра традыцыі, звычаі, гісторыю і мастацтва Беларусі. Госці з інтарэсам разглядалі свежыя выданні “Добры дух зямлі Дняпроўскай” і “На берагах Дняпра і Друці”, прывезеныя з 23-га Дня беларускага пісьменства – яго сталіцай сёлета быў Рагачоў. А на старонках газет “Голас Радзімы”, “Беларусы ў свеце” бачылі і знаёмыя твары. Была запатрабаванаю, спараджала шмат пытанняў інфармацыя для патэнцыйных турыстаў: буклеты, прыгожыя фотаальбомы… Выклікалі захапленне мастацкія фатаграфіі, узоры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва беларускага прадпрыемства “Скарбніца”. “А дзе можна купіць такія прыгожыя лялькі?” – чулася раз-пораз. Мяркуем, наступным разам трэба падумаць і пра гандаль...

Актывісты Таварыства дружбы і супрацоўніцтва “Малдова–Беларусь” ды Асацыяцыя беларусаў муніцыпія Кішынёў “Беларусь” парадавалі фэстаўцаў выдатным (жывым!) выкананнем беларускіх і малдаўскіх народных песень. Гучала таксама і сусветная класіка. Оперная спявачка Маргарыта Будзей ды яе маладая калежанка Вольга Садоўнік увесь дзень вабілі прыгожымі галасамі наведнікаў да беларускіх падворкаў. А знакамітая песня “Бывайце здаровы!” на музыку Ісака Любана, словы Адама Русака стала хітом беларускай вуліцы і шматкроць выконвалася “на біс”. Да нас прыходзілі сябры, знаёмыя, вядомыя дзяржаўныя, палітычныя, культурныя і грамадскія дзеячы. Пабыў і Пірка Тапіёла, кіраўнік дэлегацыі Еўрасаюза ў Малдове: пажадаў беларусам Малдовы вялікіх поспехаў, з задавальненнем пачаставаўся беларускім шакаладам фабрыкі “Камунарка”.

Прыемна было бачыць, як з непадробнай цікавасцю госці жадалі больш даведацца пра Беларусь, задавалі шэраг пытанняў, на якія з радасцю адказвалі сябры беларускіх суполак. Быў немалы інтарэс да беларусаў і з боку СМІ. У нас бралі інтэрв'ю малдаўскія тэлеканалы. А нацыянальны Малдаўскі канал “Maldova 1”якраз на фоне першай тытульнай старонкі Псалтыра 1517 года Францыска Скарыны зрабіў прамое ўключэнне з фестывалю, калі ішоў чарговы выпуск тэленавін.


Ім таксама падабаецца этнафестываль

На гэтым інтэрнацыянальным свяце можна было і пакаштаваць розныя смачныя стравы ды напоі беларускай кухні. А родныя нам словы “бульба”, “каўбаскі”, “дранікі”, “бярозавы сок” ды “Белавежская” дзейнічалі на гасцей беларускага падворка неяк асабліва магічна… Ну проста па вачах шаноўнага люду чыталася: смак беларускай кухні для іх ужо не проста знаёмы, але і надта падабаецца. Гендырэктар Бюро міжэтнічных адносін Алег Бабенка адзначыў, што сёлетні фестываль – наймаштабны за апошнія гады. У ім паўдзельнічала 45 этнакультурных суполак, якія прадстаўляюць 14 этнічных груп.

Культурная разнастайнасць, уласцівая малдаўскаму краю, дазваляе людзям розных нацыянальнасцяў жыць тут у міры і згодзе. А беларусы Малдовы – гэта адзін з самых яркіх узораў талерантнасці, бесканфліктнасці, працавітасці, дружалюбнага стаўлення адзін да аднаго.

**Ганна Мазур,**
старшыня праўлення
Беларускага культурнага
руху Малдовы


Да беларусаў праяўлялі цікавасць малдаўскія тэлеканалы

### Ад рэдакцыі

У чарговы раз атрымалі мы з Малдовы па электроннай пошце аўдыёфайл з запісам радыёперадачы “Беларуская крыніца”. “Гэта адзіная перадача, якая выходзіць ужо трэці год на ўзроўні Нацыянальнага радыё за мяжой на беларускай мове, — удакладняе стваральнік, рэдактар перадачы Генадзь Зяньковіч. — Адзіная — на прасторах СНД, а таксама краін Прыбалтыкі, Еўропы ў цэлым, на прасторах Паўночнай і Паўднёвай Амерык... Мы ганарымся гэтым!”.
І мы, у Беларусі, ганарымся, што такі важны праект паспяхова рэалізуюць супляменнікі ў Малдове. Пра тое і пісалі ўжо. Цяпер у стварэнні перадачы ў асноўным удзельнічаюць сябры Таварыства дружбы і супрацоўніцтва “Малдова—Беларусь”, Беларускага культурнага руху Малдовы ды Асацыяцыі беларусаў муніцыпія Кішынёў “Беларусь”. Апошні ж дасланы выпуск — гэта яскравы аповед-рэпартаж пра15-ы этнакультурны фестываль. Адначасова Генадзь Зяньковіч просіць, заклікае да ўдзелу ў перадачы ўсе іншыя беларускія суполкі Малдовы: з Цірасполя, Бельц, Бяндэр, Грыгарыопаля, Рыбніцы, Камрата... А таксама ўсіх беларусаў Малдовы, іншых краін, якія маюць што расказаць пра адметныя падзеі ў жыцці, сяброў-беларусаў, кантакты з Беларуссю. А можна, піша Генадзь, і проста заказаць любімую беларускую песню, выказаць сваё меркаванне з нагоды нейкіх падзей, датаў. Электронны адрас Генадзя Зяньковіча ёсць у рэдакцыі. Каму цікавыя такія прапановы — пішыце, паспрыяем наладжванню кантактаў.

ІНІЦЫЯТЫВЫ

# Бегаюць на здароўе

Алесь Мурочак

**Усё больш удзельнікаў збіраюць кожную суботу аматарскія забегі па прыгожых мясцінах Мінска. Хто ў стане прабегчы пяць кіламетраў — можа далучацца.**

Бегаць альбо нават хадзіць паболей – гэта, сцвярджаюць спецыялісты, вельмі важна для здароўя. І таму паркавыя забегі набылі папулярнасць сярод аматараў бегу ў многіх краінах. З'явіліся энтузіясты і ў Мінску. На сайце Minskrun.by пададзена шмат інфармацыі пра бегавы рух Minskrun, арганізаваны Спартыўным грамадскім аб'яднаннем аматарскага спорту ды валанцёрамі. Гэта – занятак для ўсіх, хто любіць бегаць на адкрытым паветры і ў кампаніі з іншымі. “Ідэя Minskrun – збіраць разам аматараў бегу для ўдзелу ў пяцікіламетровых прабегах кожную суботу, – пішуць арганізатары. – Сустракаемся ў 10 раніцы. А ўдзел у забегах цалкам бясплатны: неабходная толькі анлайн-рэгістрацыя на сайце”.

Добрую справу энтузіястаў – а гэта Аляксандр Базулька, Яна Друк, Генадзь Стокін ды іншыя – падтрымала і Амбасада Германіі ў Беларусі. Летам у прэс-рэлізе паведамлялася, што пры яе падтрымцы ў Парку Перамогі адкрыўся новы маршрут для забегаў. Старты – ля фантанаў, непадалёк ад праспекта Пераможцаў і Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Тады ж Амбасада перадала арганізатарам неабходны інвентар: секундамеры, сканеры штрых-кода, стужкі са сцяжкамі для разметкі трасы…

Між тым па-ранейшаму задзейнічана і траса ў мікраёне Зялёны Луг, старты – паблізу Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі (вул. Кастуся Каліноўскага, 111). “Нашы забегі – для вас, – кажуць арганізатары. – Мы імкнемся, каб усе ўдзельнікі атрымлівалі зарад станоўчых эмоцый, добры настрой на цэлы тыдзень. Бегаць модна, карысна і неабходна!”.

РАЗАМ

# У Карэлію – з гасцінцамі

Іван Іванаў

**Два канцэрты прайшлі на сцэнічных пляцоўках Петразаводска з удзелам артыстаў з Беларусі**

Гасцей з Бацькаўшчыны запрасіла Нацыянальна-культурная аўтаномія беларусаў Петразаводска “Белая Русь”, якой кіруе Святлана Барташэвіч. У складзе дэлегацыі на чале з намеснікам Міністра культуры Васілём Чэрнікам былі дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Вольга Антоненка, дырэктар Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Уладзімір Карачэўскі, фальклорна-этнаграфічны гурт “Неруш” БДУ, фолк-шоу-балет “Альянс” Бабруйскай дзяржаўнай школы-каледжа мастацтваў, інструментальны дуэт Гродзенскай абліфілармоніі ды фальклорны сямейны дуэт з Рэчыцы. Як паведамляецца на сайце Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў Расіі, ад ФНКА ў Карэліі пабывала намесніца старшыні па працы з рэгіёнамі Тамара Яшына.

Тры дні былі госці ў Карэліі. Гаспадары паказалі суродзічам славутасці краю, месцы кампактнага пражывання беларусаў. Абмяркоўвалі, як далей разам працаваць на карысць беларускай культуры. Прайшлі сустрэчы з Міністрам па пытаннях нацыянальнай палітыкі, сувязях з грамадскімі ды рэлігійнымі аб'яднаннямі Андрэем Маніным і намесніцай Міністра культуры Рэспублікі Карэлія Ганнай Томчык. Творчая група дэлегацыі правяла яркія канцэрты-фестывалі “Дажынкі” ды “Беларускі гасцінец”. Дарэчы, гасцінцам у беларусаў называюць і добрую дарогу, і падарунак, прывезены падарожнікам. Канцэртную пляцоўку беларусаў, павільёны беларускіх рамеснікаў на гарадскім сямейным свяце наведаў кіраўнік Рэспублікі Карэлія Аляксандр Худзілайнен.


Удзельнікі святочных канцэртаў у Петразаводску

**Даведка ГР.** Першы з'езд беларусаў Карэліі прайшоў год таму, яго вынікам стала стварэнне НКА “Белая Русь”. Цяпер у Рэспубліцы Карэлія жыве звыш 23 тысяч беларусаў.

**СУГУЧЧЫ**

# Палітра фактаў, вобразаў, лёсаў

## У "Выдавецкім доме "Звязда" пабачыла свет кніга Алеся Карлюкевіча "Літаратурнае пабрацімства. Беларусь – Туркменістан"

**Алена Стэльмах**

Літаратурна-мастацкае выданне – пра тое, як Беларусь і Туркменістан становяцца бліжэй дзякуючы намаганням пісьменнікаў, перакладчыкаў, мастакоў і журналістаў. Чытачы "Голасу Радзімы" ведаюць: вядомы журналіст, краязнаўца, літаратар, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне" Алесь Карлюкевіч мае вялікі інтарэс да сувеццяа нацыянальных літаратур: казахскай, армянскай, азербайджанскай, туркменскай… Пра тое сведчаць і ягоныя публікацыі ў розных СМІ. Алесь Карлюкевіч – аўтар многіх выданняў, ён даследуе, як літаратуры і пісьменнікі свету зближаць народы. У савецкі час, дарэчы, меўся адметны досвед літаратурнага пабрацімства, і даследчык не перастае сцвярджаць неацэнную значнасць міжнацыянальных стасункаў: і для развіцця літаратур, і для іх узаемапранікнення, і для сяброўства краін і народаў. Пра тое неяк хораша сказаў вядомы пісьменнік Алесь Бадак: "Нас раздзяляюць не толькі межы між краінамі, раздзяляюць нас межы паміж сэрцамі, мы проста не ведаем адзін аднаго. І ў гэтым плане роля літаратуры выключная: яна збліжае народы".

Сапраўды, варта прызнаць: праз літаратуру людзям розных нацыянальнасцяў магчыма пазнаваць адзін аднаго, ладзіць сяброўства. Трохі раней выйшла кніга Алеся Карлюкевіча "Братэрства" (2014), гэта цікавыя аповеды пра стасункі літаратуры Беларусі з мастацкім словам іншых краін. І вось – новая кніга: "Літаратурнае пабрацімства. Беларусь — Туркменістан". Будзе да месца згадаць, што светапогляд беларуса Алеся Карлюкевіча, які родам з вёскі Зацітава Слабада Пухавіцкага раёна Міншчыны, фармаваўся пад уплывам розных культур. Вышэйшую адукацыю атрымаў ён на Украіне: закончыў аддзяленне журналістыкі Львоўскага ваенна-палітычнага вучылішча. Прафесійная дзейнасць пачалася для маладога афіцэра ў 1985-м на туркменскай зямлі, у Ашхабадзе. "У 1981-95 гадах служыў ва Узброеных Сілах СССР і Рэспубліцы Беларусь," – чытаем у яго біяграфіі. У Беларусь афіцэр вярнуўся з багатым жыццёвым досведам, цікавымі ўражаннямі. Кніга "Літаратурнае пабрацімства" – гэта аповед пра гады вайсковай маладосці аўтара, адкрыццяў ім іншай культуры, якая і праз гады застаецца яму блізкаю. Былі шматлікія стасункі, знаёмствы, сустрэчы з туркменскімі майстрамі слова, піша аўтар і пра тое, як ішлі ды ідуць творы беларускіх пісьменнікаў да туркменскага чытача.

З асаблівым піетэтам Алесь Карлюкевіч ставіцца да вялікага паэта і мысляра Махтумкулі. Духоўны натхняльнік туркменаў стаўся паэтам усяго чалавецтва, прычым і цяпер творчасць класіка спрыяе повязям Туркменістана з Беларуссю. У сваім аповедзе пра майстра Алесь Карлюкевіч спасылаецца на пераклады выбраных вершаў Махтумкулі, прадстаўленых у кнізе "Салавей шукае ружу": яна ў 1983 годзе пабачыла свет у Мінску, у выдавецтве "Мастацкая літаратура"( серыя "Паэзія народаў СССР"). Знакавая падзея адбылася ў Мінску ў 2014 годзе: у выдавецтве "Каўчэг" выйшла цудоўная кніга-фаліянт паэзіі Махтумкулі "З кубка вечнасці мёд". Алесь Карлюкевіч з гонарам гаворыць пра творцаў, якія перастваралі высокую паэзію па-беларуску: у розны час да таго спрычыніліся Анатоль Клышка, Артур Вольскі, Алег Лойка, Алесь Звонак, Уладзімір Паўлаў, Валянціна Коўтун, Рыгор Барадулін, Уладзімір Шахавец, Пятро Прыходзька, Казімір Камейша, Мікола Мятліцкі, Віктар Шніп.



ІВАН ЖДАНОВІЧ

**Алесь Карлюкевіч дае інтэрв'ю тэлеканалу "Miras"("Спадчына"). Ашхабад, 2015 г.**

Вестуном беларускага мастацкага слова сярод туркменаў стаў Якуб Колас: ягонае апавяданне на рускай мове было надрукавана ў газеце Закаспійскай вобласці "Ашхабад". А ці ведалі вы, што першыя кнігі Янкі Купалы і Якуба Коласа пабачылі свет на туркменскай мове ў 1941-м? Кніга "Літаратурнае пабрацімства" складаецца з такіх вось цікавых адкрыццяў. Яны ж падкрэсліваюць даўнюю прыязнасць нашых народаў адзін да аднаго. Калі ж разам з аўтарам зрабіць больш глыбокі гістарычны экскурс, то ўсплываюць практычна незнаёмыя беларусам імёны землякоў, якіх туркмены вельмі шануюць. У сярэдзіне XIX стагоддзя Аляксандр Ходзька, падарожнік па Туркменістане, запісаў паэтычныя тэксты Мухтумкулі ды надрукаваў іх у Англіі. Такім чынам, беларус, які быў родам з тэрыторыі сучаснага Мядзельскага раёна Міншчыны, адкрыў Еўропе класіка туркменскай літаратуры, а праз яго заявіў свету аб туркменскім народзе. Высокай ацэнкі, на думку Алеся Карлюкевіча, варты і падзвіжнік-беларус, ураджэнец Віцебскай губерні Аляксандр Пацалуеўскі, які 25 гадоў шчыраваў на так званым "туркменскім моўным будаўніцтве". У кнізе чытаем: "З усіх беларусаў фігура Пацалуеўскага для Туркменістана – маштаба самага вялікага. І гібель яго ў землетрасенні 1948 года – страта незаменная"… Землятрус 1948 года ў Ашхабадзе (у ноч з 5 на 6 кастрычніка) названы адным з самых разбуральных у гісторыі чалавецтва. Кажуць, ні ў чым так яўна не адкрываюцца людзі, як у цяжкасцях. Прыкладамі ўзаемадапамогі і ў гады вайны, і пад час ліквідацыі наступстваў землятрусу напоўнены старонкі кнігі. Алесь Карлюкевіч высока цэніць людскую спагаду, памяркоўнасць, вылучае і вартасць мужнага мастацкага слова. Яно, наперакор няшчасцям, сцвярджалася ў сэрцах людзей, як неадольная сіла брала верх над чалавечай трагедыяй. Кранае прадстаўлены ў кнізе вобраз туркменскай паэткі Агульбеке Аразбердыевай. Настаўніца з аула прыгожая і ў патрыятычным парыве, з якім ехала на фронт, каб уручыць саматканы дыван камандуючаму 1-м Беларускім фронтам Маршалу Савецкага Саюза Канстанціну Ракасоўскаму (на дыване – ягоны партрэт!), і ў адносінах з каханым, і ў вершах… А жыццё яе было кароткім. Вядомай тая гісторыя стала дзякуючы даследаванню Алеся Карлюкевіча, якое пачаў ён з Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску – таго месца, дзе дыван, перададзены родзічамі военачальніка ў 1968 годзе, захоўваецца і цяпер. Дарэчы, нядаўна якасны фотаздымак яго дэманстраваўся на беларускай выставе ў Музеі выяўленчага мастацтва Туркменістана ў Ашхабадзе.



**Сучасны Ашхабад: горад ля падножжа Капетдага**



ФОТА З АРХІВА НАТАЛЛІ АДАМОВІЧ

**Алесь Адамовіч у туркменскага паэта Ата Саліха (у цэнтры)**

Многія з аповедаў даследчыка пачынаюцца са слоў: "прыйшлося прыкласці шмат намаганняў", "я доўга шукаў"… Заслугоўвае вялікай павагі такая беражлівасць, жаданне "раскруціць" і зберагчы танюсенькую ніцейку памяці аб чалавечых лёсах, размытых у прасторы вірамі супярэчлівага часу. Цікава расказвае Алесь Карлюкевіч пра нашых землякоў-пісьменнікаў і журналістаў Мікалая Калінковіча, Міхася Карпенку, Аркадзя Марціновіча, Васіля Ткачова, Леаніда Чыгрына. За тысячы кіламетраў ад Радзімы яны рэалізавалі свае таленты, іх творчасць збліжае нашы народы. З асаблівай павагай аўтар ставіцца і да добрых сяброў беларускай літаратуры ў Туркменістане Агагельды Аланазарава, Атаджана Тагана, Какалы Бердыева. Словы ўдзячнасці гучаць і ў адрас перакладчыцкай працы народных паэтаў Туркменістана Керыма Курбаннепесава і Каюма Тангрыкуліева.

Да агульнай карціны "Літаратурнага пабрацімства" неабходна дадаць шматколерных фарбаў з творчых здабыткаў дзіцячых туркменскіх пісьменнікаў. У розныя гады ў Беларусі выходзілі кніжкі, адрасаваныя юным чытачам: Берды Кербабаева, Ганны Кавусавай, Каюма Тангрыкуліева, Нуры Байрамава, Курбана Чаліева, Агагельды Аланазарава. "Кветкі Каракумаў" – так называецца анталогія туркменскай дзіцячай літаратуры, што выйшла ў Мінску (1990). І пра перакладчыкаў, і пра зборнікі, дзе, як яны выходзілі — распавядае ў сваёй кнізе цікаўны да творчасці сяброў даследчык.

У кнізе шмат імёнаў знакамітых людзей, чые творчыя, а ў каго й жыццёвыя шляхі-дарогі неяк спалучаны з туркменскай зямлёй: Максім Танк, Любоў Філімонава, Любоў Турбіна, Алесь Адамовіч, Браніслаў Спрынчан, Мікола Чарняўскі, Янка Сіпакоў, Алесь Бадак… Аўтары адзінадушныя ў прызнанні: пакінуты ў іх памяці след ад знаёмства з краем "не залпье ніякімі пяскамі". Сапраўды, большую частку Туркменістана займае пустыня Кара-Кум. Той, хто хоць раз яе пабачыў, адчуў яе дыханне, катэгарычна не згодзен з меркаваннем пра нікчэмнасць, мёртвую маўклівасць гэтай часткі зямлі. Вось якое цікавае апісанне пустыні ёсць у кнізе "Літаратурнае пабрацімства": "Яна і з самалёта выглядае не менш уладарнай. Пляміста-жоўтая, у воспінах белых саланчакоў і такіраў, з перарывістымі выгінамі высахлых рэчышчаў, што нагадваюць арабскія імёны, яна такая ўсеабдымная…"

Хочацца памкнуцца наўздагон за аўтарамі гэтых радкоў Алесем Адамовічам і Какалы Бердыевым. Яны ж наводзяць на думку: пустыня – гэта акіян, пустэча ў душах – вось пустыня... Таму Алесь Карлюкевіч так самаадданна рупіцца сеяць у душах аматараў мастацкай літаратуры і ў блізкім, і ў далёкім замежжы зярняты чалавечнасці, дабрыні. Ён непахісны ў веры, што наладжаныя папярэднікамі літмасты, магчымасці цяперашняй інфапрасторы, не ведаючай геаграфічных перашкод, – усё гэта ўмела спалучаць сучаснікі, каб яшчэ больш зрабіць у творчасці, каб умацоўваць сяброўства. Аўтар зноўку адпраўляе пісьмы ў Туркменістан – з вераю: будзе зваротная сувязь. Мяркуецца, што адзін са спецыяльных нумароў часопіса перакладной літаратуры "Dünyä edebiýaty" ("Сусветная літаратура") прадставіць чытачу Туркменістана беларускую літаратуру на мове Махтумкулі.

Філосафы кажуць: у тых адносінаў ёсць будучыня, для якіх пракладаюць дарогу нашыя самаадданыя намаганні, сканцэнтраваныя думкі, шчырыя і глыбокія пачуцці… Нястомнымі пошукамі, сэрцам і думкамі сваімі Алесь Карлюкевіч, як і ягоныя таленавітыя папярэднікі, безумоўна, збліжае Беларусь і Туркменістан. Плён руплівай працы, клапатліва сабраны ў глыбокую, змястоўную, мудрую кнігу "Літаратурнае пабрацімства" – гэта надзвычай важны этап на шляхах даўняга беларуска-туркменскага літаратурнага пабрацімства.

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

# Слова матчына дадому павядзе



Актывісты суполкі "Уздым" гасцююць у Опсе

## У дзейнасці суполкі "Уздым" з Даўгаўпілса прыкметная цяга да лепшых узораў беларускага пісьменства

Кожная беларуская суполка выбірае прыярытэты ў працы. Тое бачна, дарэчы, калі ўважліва чытаць "Голас Радзімы". Я ж хачу падзяліцца досведам таго, як мы выкарыстоўваем велізарны патэнцыял беларускай літаратуры.

### Дзень беларускага пісьменства на Браслаўшчыне

Дзень беларускага пісьменства праходзіў 18 верасня ў аграгарадку Опса, што ў Браслаўскім раёне Віцебшчыны. У свяце паўдзельнічалі актывісты нашай суполкі Людміла Сінякова, Вольга і Мікола Паўловічы, Зінаіда Сіліня і Айвар Сіліньш, Станіслаў Валодзька, а таксама даўгаўпілскія музыкі Вера Грынберт і Эдуард Зарыньш. У актавай зале Опсаўскай школы выступалі паэты Браслаўшчыны Даніла Воўчык, Вольга Ляснеўская, Святлана Цыўнэль, Алена Радзевіч, Наталія Пушкарова. Я расказала аб працы нашай суполкі, чытала вершы Паўла Плотнікава і Станіслава Валодзькі, а Вера Грынберт пад акампанімент Эдуарда Зарыньша выканала песні на словы С. Валодзькі. Гучалі беларускія народныя, аўтарскія песні ў выкананні браслаўскага гурта "На панадворку" (мастацкі кіраўнік Марына Шыркевіч): у яго, дарэчы, сёлета 20-я ўгодкі. Гаспадароў і гасцей свята віталі старшыня Браслаўскага райсавета Ніна Пучынская, у зале была і Антаніна Абалевіч, кіраўніца аддзела па ідэалагічнай рабоце, культуры і справах моладзі райвыканкама. У фае разгарнулася выстава кніг паэтаў літаб'яднання "Ветразь надзеі" Браслаўшчыны і даўгаўпілскіх літаратараў.

Мы наведалі музей літаратуры, створаны пры мясцовай школе. Разглядалі там стэнды са здымкамі, біяграфіямі тых пісьменнікаў, што маюць на Браслаўшчыне родавыя карані, кнігі з іх аўтографамі, у тым ліку і нашага сябра, даўгаўпілскага паэта Зянона Бурага.



Вечарына ў Даўгаўпілсе да 125-х угодкаў М. Багдановіча

Свята прадоўжылася ў Доме культуры: нас гасцінна сустракалі там сябры мясцовай літсуполкі. У сяброўскай бяседзе за кубачкам кавы гучалі вершы, песні, пажаданні. Зінаіда Сіліня выканала песню "Зорка Венера". Дамовіліся: падобныя сустрэчы будуць мець працяг.

### Зорка Венера ўзышла…

Тымі ж днямі ў Малой зале Палаца культуры Даўгаўпілса прайшла ўрачыстасць да 125-х угодкаў Максіма Багдановіча. У канцэрце "Зорка Венера ўзышла над зямлёю", арганізаваным суполкай "Уздым", паўдзельнічалі гурт народнай песні "Купалінка" (кіраўнік Вячаслаў Пятроў), танцавальны гурт "Лянок" (кіраўніца Марына Медуніцкая), ансамблі "Ластаўкі" (кіраўніца Тацццяна Піменава) і "Пралескі" (кіраўніца Анастасія Малышава).

Многія чытачы "Голасу Радзімы" ведаюць: шмат гадоў восенню па ініцыятыве Саюза беларусаў Латвіі ў краіне праходзяць Дні беларускай культуры. Сёлета канцэртам "Зорка Венера..." пачаўся шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных юбілею Максіма Багдановіча: яны праходзяць у беларускіх суполках па ўсёй Латвіі. Мы гаварылі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Вядучыя Зінаіда Сіліня і Валянціна Ліпінская быццам запрасілі ўсіх на адкрыты ўрок у беларускую школу, у якой у ролі вучняў былі Алена Радзівонава і Уладзімір Стасевіч з маладзёжнага крыла "Уздыма", а я – настаўніцай. Гутарка дапаўнялася выступленнямі: гурты спявалі, танцавалі. Гучалі й вершы Максіма Багдановіча, а таксама песні (вершы Станіслава Валодзькі, музыка Тацццяны Піменавай), прысвечаныя класіку. Аповед пра яго творчасць дапоўніла фотапрэзентацыя Таццяны Дзянісавай.

Да свята краязнаўца Мікола Паўловіч стварыў выставу, прысвечаную дзейнасці Сяргея Сахарава – цяпер яна дэманструецца ў Цэнтры беларускай культуры. На канцэрце прысутнічаў консул Генконсульства Беларусі Дзмітры Канстанцінаў, кіраўніца Цэнтра беларускай культуры Жанна Раманоўская, нашы сябры з суполкі "Вясёлка" з горада Краслава: старшыня праўлення Святлана Стэльмачонак і яе намеснік Аляксандр Клімаў.

Мы ўдзячны за фінансавую падтрымку праекта Даўгаўпілскай гарадской думе, а таксама Цэнтру беларускай культуры, фірмам, што дапамаглі ўпрыгожыць свята, СМІ, якія праявілі да яго інтарэс.

**Людміла Сінякова,** старшыня таварыства "Уздым", г. Даўгаўпілс

ТВОРЧАСЦЬ

# Шанец для таленавітых

**Рыгор Арэшка**

**Маладыя літаратары ад 18 да 30 гадоў могуць паўдзельнічаць у міжнародным літаратурным конкурсе "Першацвет", які ў Беларусі праводзіцца ўпершыню**

Конкурс літаратараў будзе штогадовым і, лічаць арганізатары (Міністэрства інфармацы, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Выдавецкі дом "Звязда", выдавецкае прадпрыемства "Мастацкая літаратура"), дапаможа адкрываць новых таленавітых аўтараў. Ужо ідзе першы прыём твораў. Пра тонкасці справы можна больш даведацца на сайце Мініінфармацыі. У бліц-інтэрв'ю для партала http://sozvuchie.by/, які прысвечаны літаратуры і публіцыстыцы краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў, галоўны рэдактар часопіса "Маладосць" Святлана Дзянісава сцвярджае: "Сам факт аб'яўлення такога конкурсу павінен пераканаць маладога літаратара: напісанае варта паказаць прафесіяналам, а не толькі сябрам і родным".

Што важна: у конкурсе могуць паўдзельнічаць таксама і замежныя грамадзяне. На конкурс прымаюцца паэтычныя і празаічныя творы, якія не публікаваліся раней і не ўдзельнічалі ў іншых конкурсах. Аб'ём твора пры тым не павінен перавышаць трох аўтарскіх аркушаў. Кожны ўдзельнік конкурсу мае права накіроўваць арганізатарам толькі адзін твор на рускай альбо на беларускай мове. Іх разгледзіць экспертны савет. Аўтараў дзесяці паэтычных і дзесяці празаічных твораў, якія набралі найбольшую колькасць балаў, ён прызнае пераможцамі конкурсу.

Не спазніцеся: матэрыялы прымаюцца ў электронным выглядзе па адрасе projects.zviazda@gmail.com з 1 сакавіка па 30 кастрычніка ўключна.

ЛІНІЯ ЖЫЦЦЯ

# Гульня ў імя дабрыні

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**

Спачатку яму было смешна, потым падумаў: можна паспрабаваць.

Пачаў рабіць арганізацыйныя захады ў 2014-м, і ўрэшце сёлета ў лютым атрымаў пасведчанне аб рэгістрацыі клуба "Росток". Паводле задумы кіраўніка, ад гэтага "парастка"пойдуць у рост і добрыя футбалісты, і здаровыя хлопцы, і новыя ідэі. Адным з трэнераў клуба стаў 19-гадовы Давыд Бялецкі, старэйшы сын Юрыя. Хлопец завочна вучыцца на спортфаку ў Брэсцкім дзяржуніверсітэце і паспяхова рыхтуе да гульняў каманду. 9 мая клуб паспяхова адыграў першую афіцыйную гульню: з лікам 5:2 перамог каманду Пружанскага раёна. З'яўляюцца і новыя ідэі. Яшчэ летась "Росток" арганізаваў турнір "Усё ў тваіх руках" з удзелам выхаванцаў дзіцячых дамоў з вёсак Дзівін, Быцень і Кобрынскай дзіцячай вёскі. "Былі трэніроўкі, спаборніцтвы, да таго ж мы з хлопцамі неаднаразова наведвалі дзіцячыя дамы ў раёне, гулялі з іх выхаванцамі ў футбол, – расказвае Юры. – Потым правялі першы турнір. Дарэчы, гэта вельмі важны для нас кірунак працы. Я сам рос у не лепшай сям'і, а таму з дзяцінства марыў, каб было па-іншаму. Хочацца, каб і выхаванцы мае гэта разумелі. Помню, была паездка ў адну школу-інтэрнат, у маіх выхаванцаў быў не лепшы настрой. Каб хоць нечым парадаваць дзетак з інтэрната, мае хлопцы кажуць: давайце прайграем ім... І прайгралі, і не пашкадавалі – бо ўбачылі ў вачах дзяцей шчасце".



Для хлопчыкаў з Жабінкі вялікі футбол толькі пачынаецца

Юры Мікалаевіч марыць стварыць у Жабінцы і футбольны цэнтр для дзяцей-сірот: "Гэта бачыцца як тэрыторыя, дзе стаяць дамы для некалькіх прыёмных сем'яў, пры іх – інфраструктура для трэніровак. Як вядома, у дзяцей-сірот не заўсёды ёсць магчымасць рэалізаваць сябе, свае здольнасці. Важна, каб побач быў чалавек, які накіруе, дапаможа... Звычайна тым займаюцца бацькі. Мне й самому вельмі хочацца, каб мае дзеці знайшлі сваё месца ў жыцці. І ўсё, што ад мяне залежыць, стараюся для таго рабіць. А сіроты? Я не хачу і не магу заставацца ўбаку. Не ведаю, ці ўдасца мне гэта зрабіць, але рухаць праект будзем".

Спадзяюся, усё ў яго атрымаецца. Як вядома, беларусы – людзі добрыя і спагадныя. Ну і футбольных фанатаў у нас дастаткова, а гэта – змагары за ідэю. А сам Юры ўжо ідзе да мэты. Так, з 13 чэрвеня па 10 ліпеня па ўсёй Беларусі прайшла акцыя "Добрая Майка". Збіралі грошы на адкрыццё дзённага цэнтра для заняткаў футболам дзяцей-сірот. Вядомыя спартсмены, журналісты, артысты на адным спартыўным інтэрнэт-партале распавядалі гісторы пра свае любімыя футболкі, аддавалі потым іх для продажу на дошцы аб'яваў партала kufar.by. "Сёе-тое сабраць удалося, пакуль – малавата, – кажа Юры. – Але і мы не адступаем: шукаем спонсараў і спадзяемся, што пра Жабінку будуць ведаць не толькі цукровы горад, але і як футбольны, сапраўдную кузню футбольных кадраў".

Дарэчы, стваральную сацыяльную актыўнасць Юрыя Бялецкага заўважылі ў УЕФА. У плыні Дня масавага футбола ў намінацыі "Лепшы лідэр" ён узяў першае месца, апярэдзіўшы шведа, італьянца. Якая ўзнагарода яго чакае, пакуль не ведае, але ў Жабінцы чакаюць новыя футбольныя мячы.

**Заснавальнік:** Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск

**Рэдактар** Віктар Міхайлавіч Харкоў

**Адрас рэдакцыі:** пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005

**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61.** Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 290 60 11

**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31

**E–mail:** golas_radzimy@tut.by

**Аб'ём выдання:** 1 друк. арк.

**Тыраж:** 1930, **Заказ:** 1497

**Час падпісання ў друк:** 20.10

Выходзіць 1 раз на тыдзень

Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.

© "Голас Радзімы", 2016